# НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ АРХІЎ БЕЛАРУСІ

## ТЭМАТЫЧНЫ ПЕРАЛІК ДАКУМЕНТАЎ ДА ВЫСТАВЫ ПА ГІСТОРЫІ ПАЎСТАННЯ 1863-1864 ГГ. НА ТЭРЫТОРЫІ ВІЦЕБСКАЙ, МАГІЛЁЎСКАЙ І МІНСКАЙ ГУБЕРНЯЎ

| № № п/п | Дата дакумента | Загаловак дакумента альбо справы, анатацыя да дакумента альбо справы | Пошукавыя дадзеныя (ф., воп., спр., арк.) | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | 1861 г. | Брашура «Песні набожныя» з двума вершамі на беларускай мове, у т.л. будучым гімнам паўстанцаў. | Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 31237. – Арк. 4-6 адв. | Друк |
| 2 | 18 лютага 1863 г. | Рапарт прыстава 2-га стана Барысаўскага пав. Адама Ляцкага мінскаму грамадзянскаму губернатару аб праведзеных арыштах у павеце. | Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 1527. – Арк. 22-25. | Рукапіс, арыгінал |
| 3 | 20 красавіка 1863 г. | Рапарт ваеннага начальніка Навагрудскага пав. камандыру 3 пяхотнай дывізіі са спісам паўстанцаў з атрада Адама Пуслоўскага і Феліцыяна Лашкевіча, узятых у палон 7 красавіка 1863 г. у баі ля м. Налібокі Ашмянскага пав. | Ф. 296. – Воп. 1. – Спр. 29б. – Арк. 1-3 адв. | Рукапіс, арыгінал |
| 4 | 22 красавіка 1863 г. | Паказанні вазніцы Мацея Жыбінскага пра збор атрада паўстанцаў у фальв. Дамашкавічы Барысаўскага пав. | Ф. 295. - Воп. 1. – Спр. 1547. – Арк. 1-1 адв. | Рукапіс, арыгінал |
| 5 | 25 красавіка 1863 г. | Рапарт ваеннага начальніка Слуцкага пав. аб разбіцці расійскімі войскамі 22 красавіка 1863 г. ля в. Азярніцы Слуцкага пав. паўстанцкага атрада пад камандаваннем Уладзіслава Машэўскага і Браніслава Вэндарфа з дадаткам іменнага спісу ўзятых у палон паўстанцаў. | Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 1537. – Арк. 7-12 адв. | Рукапіс, арыгінал |
| 6 | 1 траўня 1863 г. | Указ Сената Віцебскаму губернскаму праўленню аб прызначэнні члена Дзяржаўнага Савета генерала ад інфантэрыі М.М. Мураўёва віленскім ваенным губернатарам, генерал-губернатарам Гродзенскім, Ковенскім і Мінскім і | Ф. 1416. – Воп. 2. – Спр. 12672. – Арк. 1-1 адв. | Друк, рукапіс, арыгінал |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|
| | | камандуючым войскамі Віленскай войсковай акругі з падначаленнем Віцебскай і Магілёўскай губ. | | |
| 7 | 9 траўня 1863 г. | Загад віленскага генерал-губернатара М.М. Мураўёва віцебскаму губернатару аб абвяшчэнні Віцебскага, Невельскага, Веліжскага, Гарадоцкага і Суражскага пав. Віцебскай губ. на ваенным становішчы і аб абавязку падначальвацца камандуючаму войскамі ў Віцебскай губ. генерал-лейтэнанту Э.К. Длатоўскаму ў падаўленні паўстання. | Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 31307. – Арк. 7. | Друк, рукапіс, арыгінал |
| 8 | 10 траўня 1863 г. | Спіс навучэнцаў горы-горацкіх навучальных устаноў (сельгасінстытута, вучылішча і таксатарскіх класаў), якія прынялі ўдзел у паўстанні і ў захопе г. Горкі паўстанцамі 24 красавіка 1863 г. | Ф. 3257. – Воп. 1. – Спр. 53. – Арк. 2-2 адв. | Рукапіс, арыгінал |
| 9 | 15 траўня 1863 г. | Загад магілёўскага грамадзянскага губернатара А.П. Бяклемішава аб абвяшчэнні Магілёўскай губерні на ваенным становішчы. | Ф. 3257. – Воп. 1. – Спр. 1. – Арк. 16. | Друк |
| 10 | 18 траўня 1863 г. | Рапарт барысаўскага павятовага ісправуніка маёра Варанца мінскаму грамадзянскаму губернатару А.Л. Кажэўнікаву аб разбіцці ля в. Парэчча Барысаўскага пав. паўстанцкага атрада Герыка Дмахоўскага. | Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 1527. – Арк. 94-95. | Рукапіс, арыгінал |
| 11 | 24 траўня 1863 г. | Паказанні селяніна фальварка Навасёлкі Ігуменскага пав. Рыгора Андросіка, дадзеныя ў канцылярыі мінскага грамадзянскага губернатара, аб нападзе паўстанцаў 21 красавіка 1863 г. на Навасёлкі і забойстве і раненні некалькіх сялянаў. | Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 1541. – Арк. 4-4 адв. | Рукапіс, арыгінал |
| 12 | 24 траўня 1863 г. | Інструкцыя віленскага генерал-губернатара М.М. Мураўёва для ўладкавання ваенна-грамадзянскага кіравання ў паветах Віленскай, Ковенскай, Гродзенскай, Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай губерняў (на рускай і польскай мовах). | Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 31299. – Арк. 43-46. | Друк, копія |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|
| 13 | 5 чэрвеня 1863 г. | Загад камандуючага войскамі Віленскай вайсковай акругі М.М. Мураўёва мінскаму ваеннаму губернатару аб расстрэле камандзіра паўстанцкага атрада Адама Пуслоўскага. | Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 1565. – Арк. 6-8 адв. | Рукапіс, арыгінал |
| 14 | 15 чэрвеня 1863 г. | Рапарт мінскага паліцмайстра мінскаму грамадзянскаму губернатару аб спагнанні 175 руб. срэбрам у якасці штрафа з сямі памешчыц і дваранак Мінскага пав. за нашэнне жалобнага адзення без дазволу. | Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 1539. – Арк. 10-10 адв. | Рукапіс, арыгінал |
| 15 | 18 чэрвеня 1863 г. | Пратакол пасяджэння Магілёўскай следчай камісіі аб складзе, прынцыпах дзейнасці і планах камісіі. | Ф. 3257. – Воп. 1. – Спр. 1. – Арк. 92-93. | Рукапіс, арыгінал |
| 16 | 18 чэрвеня 1863 г. | Спіс асобаў, маёмасць якіх, паводле пастаноў Віцебскай следчай камісіі, падлягала секвестру за дачыненне іх да паўстання. | Ф. 1416. – Воп. 3. – Спр. 13219. – Арк. 45. | Рукапіс, арыгінал |
| 17 | 21 чэрвеня 1863 г. | Рапарт ігуменскага павятовага ісправўніка мінскаму грамадзянскаму губернатару аб разбіцці ў чэрвені 1863 г. ля вак. Перуноў Мост Ігуменскага пав. паўстанцкага атрада Баляслава Свентарэцкага, паланенні Гектара Карказевіча і іншых паўстанцаў і пераследванні рас. войскамі рэшткаў атрада ў Ігуменскім пав., а таксама пра колькасць паўстанцаў, зняволеных у г. Ігумене і адпраўленых з г. Ігумена ў г. Мінск | Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 1538. – Арк. 4-4 адв. | Рукапіс, арыгінал |
| 18 | 31 жніўня 1863 г. | Спіс асобаў, якія прынялі ўдзел у паўстанні альбо садзейнічалі яму ў Пінскім пав. | Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 1522. – Арк. 27-28. | Рукапіс, арыгінал |
| 19 | верасень 1863 г. | Прашэнне западозраных у дапамозе паўстанцам, арыштаваных і зняволеных у мінскім турэмным замку братоў дваранаў Францішка і Яна Бужымскіх да архіепіскапа мінскага і бабруйскага Міхаіла аб перахрышчанні іх у праваслаўе і вызваленні з-пад арышта. | Ф. 296. – Воп. 1. – Спр. 75. – Арк. 8-9. | Рукапіс, арыгінал |
| 20 | 4 лістапада 1863 г. | Загад віленскага генерал-губернатара М.М. Мураўёва | Ф. 1430. – Воп. 1. – | Друк, |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|
| | | віцебскаму губернатару аб ссылцы ксяндза Полацкага дамініканскага кляштара Людвіка Пагоскага ў Арэнбургскую губ. і ксяндза Віцебскага касцёла Св. Варвары Паўла Латача ў Пермскую губ. як «цалкам недабранадзейных у палітычных адносінах» і аб следстве пра арыштаванага прыёра Полацкага дамініканскага кляштара Пятроўскага, западозранага ў агітацыі на карысць паўстання. | Спр. 31276. – Арк. 10-11. | рукапіс, арыгінал |
| 21 | 7 снежня 1863 г. | Рапарт віцебскага губернатара камандуючаму войскамі Віленскай вайсковай акругі М.М. Мураўёву аб фарміраванні, дзейнасці і знішчэнні ў красавіку 1863 г. паўстанцкага атрада пад камандаваннем Ігната Будзіловіча ў Аршанскім пав. і аб суджэнні ўзятых у палон паўстанцаў у Смаленскай ваенна-суднай камісіі. | Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 31289. – Арк. 4-9 адв. | Друк, рукапіс, чарнавік |
| 22 | 15 снежня 1863 г. | Рапарт прystава 1-га стана Сенненскага пав. Лапіцкага Аршанскай следчай камісіі аб галоўных удзельніках паўстання і дзейнасці паўстанцаў у гэтым стане, у т.л. атрадаў Рычарда Камароўскага і Ігната Будзіловіча. | Ф. 3255. – Воп. 1. – Спр. 3. – Арк. 159-160 адв. | Рукапіс, арыгінал |
| 23 | лістапад-снежань 1863 г. | «Усепадданейшы адрас» дваранаў Мінскай губ. імператару з нагоды падаўлення паўстання. | Ф. 320. – Воп. 1. – Спр. 397. – Арк. 1-1 адв. | Ротапрынт, арыгінал |
| 24 | студзень 1864 г. | Спіс удзельнікаў паўстання, маёмасць якіх падлягала канфіскацыі ў казну. | Ф. 162. – Воп. 1. – Спр. 116. – Арк. 39-40. | Друк, арыгінал |
| 25 | 22 лютага 1864 г. | Указ Мінскага губернскага праўлення ігуменскаму павятовому страпчаму аб данясенні губернскаму праўленню пра канфіскацыю маёмасці асуджаных удзельнікаў паўстання Адама Берасневіча, Вінцэнта Войны і іншых 23 асобаў. | Ф. 162. – Воп. 1. – Спр. 116. – Арк. 33. | Друк, рукапіс, арыгінал |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |
| 26 | люты 1864 г. | Артыкульны спіс асобаў, асуджаных Мінскай ваена-суднай камісіяй пры Каломенскім пяхотным палку ў г. Мінску за ўдзел у паўстанні і спачуванне яму. | Ф. 296. – Воп. 1. – Спр. 90. – Арк. 3-17. | Рукапіс, арыгінал |
| 27 | 18 красавіка 1864 г. | Распараджэнне віленскага генерал-губернатара М.М. Мураўёва мінскаму грамадзянскаму губернатару аб перарабленні з каталіцкай у праваслаўную каменнай капліцы ў с. Багушэвічы Ігуменскага пав. камандзіра паўстанцкага атрада памешчыка Баляслава Свентарэцкага. | Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 1638. – Арк. 11-11 адв. | Рукапіс, друк, арыгінал |
| 28 | 28 красавіка 1864 г. | Экзэкуцыйны аркуш аб выкананні 28 красавіка 1864 г. у г. Магілёве смяротнага прысуду над вольнапрактыкуючым доктарам Мінскай губ. і паўстанцкім камісарам Мінскага ваяводства Міхалам Аскеркам. | Ф. 3256. – Воп. 2. – Спр. 29. – Арк. 34-34 адв. | Рукапіс, арыгінал |
| 29 | 30 красавіка 1864 г. | Іменны спіс 9 сямей, якія жылі ў ваколіцах Рэпішча і Тарнагурка Ігуменскага пав. і былі прызначаны да высялення ў Томскую губ. за падтрымку паўстанцаў. | Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 1522. – Арк. 83-84 | Рукапіс, копія |
| 30 | 11 чэрвеня 1864 г. | Пастанова Часовага палявога аўдытарыята, канфірмаваная 31 траўня 1864 г. М.М. Мураўёвым, аб прысуджэнні за ўдзел у паўстанні да пазбаўлення правоў дваранства, канфіскацыі маёмасці і ссылкі на пасяленне ў «больш аддаленыя месцы Сібіры» двараніна Рагачоўскага пав. Мікалая Марціноўскага. | Ф. 3256. – Воп. 2. – Спр. 28. – Арк. 10 адв.-11 адв. | Рукапіс, копія |
| 31 | 8 ліпеня 1864 г. | Загад віленскага генерал-губернатара М. М. Мураўёва мінскаму грамадзянскаму губернатару аб закрыцці землямерска-таксатарскіх класаў пры Мінскай гімназіі з прычыны «шкоднага накірунку» яе выхавальнікаў мясцовага паходжання. | Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 1647. – Арк. 1-1 адв. | Рукапіс, друк, арыгінал |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |
| 32 | 1 кастрычніка 1864 г. | Алфавітны спіс асобаў, асуджаных за ўдзел у паўстанні 1863-1864 гг. да пазбаўлення правоў стану, канфіскацыі маёмасці і ссылкі. | Ф. 319. – Воп. 1. – Спр. 479. – Арк. 1-65. | Друк |
| 33 | 18 снежня 1864 г. | Загад памочніка віленскага генерал-губернатара А.Л. Патапава віцебскаму губернатару аб арышце ў выпадку з’яўлення ў Віцебскай губ. удзельніка паўстання штабс-капітана Яраслава Дамброўскага, які 2 снежня 1864 г. уцёк з-пад варты ў г. Маскве. | Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 31477. – Арк. 1-1 адв. | Друк, рукапіс, арыгінал |
| 34 | 1864 г. | Іменны спіс 38 сялянаў Віцебскага, Лепельскага, Невельскага і Себежскага пав., узнагароджаных медалямі і грашовымі сумамі за актыўны ўдзел у падаўленні паўстання. | Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 31663. – Арк. 16-17 адв. | Рукапіс, чарнавік |
| 35 | 2 траўня 1867 г. | Цыркуляр міністра ўнутраных спраў статс-сакратара П.А. Валуева губернатарам аб абвяшчэнні 16 красавіка 1866 г. указа аб аблягчэнні пакарання некаторым катэгорыям сасланых удзельнікаў паўстання і аб парадку вяртання правоў і дазволу на вяртанне на радзіму іншаземным падданым. | Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 1812. – Арк. 21-21 адв. | Друк, рукапіс, арыгінал |
| 36 | 6 траўня 1874 г. | Рапарт мазырскага павятовага ісправўніка мінскаму губернатару аб прыбыцці без пісьмовага дазволу ў маёнтак Мерлін Мазырскага пав. да свайго бацькі сасланага ў г. Омск за дачыненне да паўстання і пераведзенага затым у Седлецкую губ. Баляслава Феліксавіча Млынскага. | Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 2539. – Арк. 1-1 адв. | Рукапіс, арыгінал |
| 37 | 9 студзеня 1876 г. | Запыт таварыша міністра ўнутраных спраў да мінскага губернатара пра магчымасць дазволіць сасланым у Сібір за ўдзел у паўстанні дваранам Ігуменскага пав. Іардана і Іосіфу Корбутам вярнуцца на радзіму. | Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 3035. – Арк. 1-2. | Рукапіс, арыгінал |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |
| 38 | 27 сакавіка 1876 г. | Паведамленне генерал-губернатара віленскага, гродзенскага і ковенскага мінскаму грамадзянскаму губернатру аб вяртанні на радзіму з эміграцыі і ссылцы ў Кастрамскую губ. удзельніка паўстання вольнапрактыкуючага доктара г. Навагрудка Уладзіслава Барзабагатага і аб падачы яго жонкай Францішкай прашэння аб прыняцці яе з дзецьмі Уладзіславам і Веранікай у расійскае падданства. | Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 2747. – Арк. 9-10. | Рукапіс, арыгінал |

Складальнік:
вядучы навуковы супрацоўнік Д.Ч.Матвейчык

Дырэктар Д.У. Яцэвіч
22.05.2013